Установа адукацыі “ Скідзельскі дзяржаўны каледж”

# Літаратурная вечарына “Я ўсяго Васілёк…”

Выканала: куратар 300 групы Бардакова М.С.

Анатацыя

Скідзельшчына – своеасаблівы куточак Беларусі з багатай, слаўнай і цікавай гісторыяй. На  Скідзельскай зямлі нарадзілася шмат таленавітых людзей. Сярод іх паэт-рэвалюцыянер былой Заходняй Беларусі Міхась Васілёк (Міхаіл Восіпавіч Касцевіч).

Для свайго літаратурнага імя ён узяў назву звычайнай кветкі нашага поля, якая даўно стала сімвалам красы Беларусі. Васілёк рос на сялянскай ніве побач з коласам. На добрай народнай ніве выспяваў талент паэта.

У распрацоўцы расказваецца пра жыццё, літаратурную творчасць і грамадскую дзейнасць паэта, падымаецца  актуальнасць выхавання любові да роднага краю, павагі да знакамітых землякоў.

Для моладзі вельмі важна ведаць сваё мінулае, свае карані, асэнсоўваць сваё месца ў сучаснасці, каб з надзеяй глядзець у будучае.

**Мэта:** Выхаванне любові і павагі да Радзімы, Прынёманскага краю, да Скідзельшчыны, да людзей, праславіўшых сваю краіну.

**Задача:** фарміраваць нацыянальны гонар за сваю малую радзіму;
замацаваць у памяці навучэнцаў імёны людзей, якія праславілі сваю Радзіму, змагаліся за яе свабоду і шчасце народа;
стварыць умовы для абуджэння ў вучняў цікавасці да гісторыі малой радзімы;
выхоўваць пачуццё годнасці за сваю краіну і гатоўнасць да выканання сацыяльных роляў грамадзяніна, патрыёта, працаўніка дзяржавы.

**Абсталяванне:** выстава кніг Міхася Васілька, партрэт паэта, снапы жыта з васількамі.

**Я ўсяго Васілёк…**

Гучыць песня на словы К. Буйлы “Люблю мой край, старонку гэту”

*Куратар:* Скідзельскі край вельмі прыгожы. Прырода надзяліла яго непаўторнай красой. Нёман, Котра, Пыранка, Спушанка, Скідлянка, азёры, лясы, дубровы і бары…

Скідзель – сучасны індустрыяльны горад. Ён славіцца сваімі культурнымі і спартыўнымі традыцыямі.

Скідзельшчына – самабытны куточак Беларусі з багатай, слаўнай і цікавай гісторыяй. Тут адбылося шмат важных цікавых гісторый. Тут адбылося шмат важных, значных падзей.

Скідзельская зямля дала многа таленавітых людзей.

*1 вяд.* Ёсць людзі, якія запамінаюцца на ўсё жыццё ад першай з ім сустрэчы. Яны прыцягваюць да сябе сваёй ветлівасцю, адкрытасцю, чысцінёй душы. Да такіх людзей адносіцца і Міхась Васілёк.

А быў ён родам нездалёк-
Там Котра хвалю сцеле.
І жыў на свеце Васілёк,
Або – Міхась Касцевіч.

*2 вяд.* Васілёк – вельмі мілае, сціплае літаратурнае імя паэта самародка Міхася Восіпавіча Касцевіча. Яно найлепш адпа вядае і складу яго натуры, і яго паэзіі, што вылівалася з глыбінь народнага жыцця.

Ён быў вельмі добрым, лагодным, шчырым і даверлівым чалавекам, любіў людзей. Яшчэ ў гады сваёй маладосці казаў: “Зразумець душу чалавека нельга інакш, як палюбіць гэтага чалавека”. Душу Міхася Васілька, відаць, патрэбна адмыкаць тым жа ключом, якім ён адмыкаў душы іншых людзей: палюбі – пазнаеш.

*1 вяд.* Міхась Васілёк нарадзіўся 14 лістапада 1905 года ў вёсцы Баброўня, Гродзенскага раёна, Гродзенскай вобласці, у сям’і лесніка. Баброўня – гэта калыска песняра, гэта пачатак яго жыццёвай дарогі, дарогі да людзей.

Цудоўная мясціна ў лесе, на беразе жывапіснай Котры. Гэта незвычайна казачны куток роднай зямлі.

Вучань чытае верш “Не пытай”

*2 вяд.* Пятро Прыходзька ў сваім вершы, адрасаваным Васільку піша:

Нашы продкі ў ліхалецці
Многа зведалі пакут,
Але ў кожнага на свеце
Ёсць з маленства родны кут.
Мо таму, што будавалі
Хаткі тут свае бабры
І Баброўняю назвалі
Людзі вёсачку ў бары…

*1 вяд.* У Васілька было звычайнае басаногае дзяцінства на беразе жывапіснай Котры. Гады дзяцінства прайшлі ў роднай вёсцы. Потым бежанства ў Расію ў час 1-ай сусветнай вайны. Сярэднюю адукацыю атрымаў у 1921 годзе ў Мічурынску.

Там перажыта рэвалюцыя, грамадзянская вайна. Маці памерла ад сухотаў у першы год бежанства. Бацька і ў бежанстве служыў лесніком. Яго абход быў далёка ад дому. Дзеці заставаліся фактычна без догляду. Міхась хадзіў на матчыну магілу і цэлымі днямі плакаў наўзрыд. Устрывожаны бацька даў знаць сваім братам, якія яшчэ з даваеннага часу жылі ў Казлове. Яны прыехалі і забралі сірат да сябе.

*2 вяд.* У 1922 годзе вярнуліся ў мілую сэрцу Баброўню. Але тут ужо гаспадарыў белапольскі рэжым. Сям’я Касцевічаў жыла бедна. Ім прыходзілася пазычыць усё: бульбу і хлеб на пражытак, каня ўзараць поле, прывезці дроў…Сёстры Надзя і Глаша пасвілі чужых кароў і авечак. Некалькі год прайшло ў беспрасветнай працы, пакуль узбіліся на сваю бульбу, хлеб, малако.

У адным з вершаў Васілёк піша:

Нудна цячэш ты жыццё сіратлівае,
Чым я адзначу свой век малады.

Шэрай імглою густою спавітыя
Шпарка бягуць за гадамі гады.

*1 вяд.* Будучы паэт бярэ ўдзел у рэвалюцыйным руху. Яго не раз арыштоўвалі, садзілі ў турму.

Верш “Грымі, не моўкні ліра”

Міхась Васілёк – адзін з пачынальнікаў беларускай літаратуры ў Заходняй Беларусі. У друку пачаў выступаць у 1926 годзе. У сваіх творах ён выказваў думкі і пачуцці прыгнечанага народа.

Верш “Песні мае”

*2 вяд.* Талент Міхася Васілька вырас на ўздыме рэвалюцыйнай хвалі. Васілька ведаў, чытаў і любіў народ. Яго вершы чыталі са сцэны вясковых гурткоў самадзейнасці. Яны клікалі народ на барацьбу за вызваленне. Вершы яго завучваліся на памяць, чыталіся на рэвалюцыйных сходах і мітынгах, выконваліся як народныя песні, шырока друкаваліся ў Віленскіх газетах і часопісах.

Верш “ Ой, не вечна”

*1 вяд.* Цэлымі тыднямі не быў дома Васілёк, хадзіў па вёсках, арганізоўваў гурткі Грамады . У 1926годзе быў утвораны гурток Грамады ў Баброўні. Па ініцыятыве Васілька быў пастаўлены першы спектакль. Міхась Васілёк быў душою сходаў, вечароў, таварыскіх сустрэч, ён гаварыў прамовы, чытаў вершы, гутарыў, жартаваў. Абсяг яго падарожжаў станавіўся шырэй і шырэй: Скідзель – Гродна – Вільня.

У гэты час Васілёк вельмі многа піша. Рэдка які нумар “Маланкі” выходзіў без яго вершаў.

*2 вяд.* У друку Міхась Васілёк пачаў выступаць у 1926 годзе. Першы зборнік “Шум баравы” канфіскавала і знішчыла паліцыя, рукапіс другога

зборніка быў знішчаны дыфензівай. Пазней былі выдадзены зборнікі: “Выбраныя вершы”, “Выбраныя творы”, “Зоры над Нёманам”, “Вершы”.

Па ўсёй Беларусі моладзь чытала яго сатырычныя творы.

Верш “ Як я пана перанёс”

*1 вяд.* Паэтычны голас Міхася Васілька дапаўняўся галасамі: Машары, Пестрака, Салагуба, Таўлая. У 30-я гады прыйшлі да чытача Танк, Іверс, Граніт… Літаратура Заходняй Беларусі вырасла ў баявую патрыятычную сілу, Васілёк пісаў:

Мы барацьбой гарым, мы сіла,-
У нас жыве бунтарны дух,
На барыкады пойдзем смела
Далоў ярмо, прыгон-ланцуг.

Гэты верш стаў песняй-гімнам перадавой моладзі Заходня Беларусі.

*2 вяд.* У 1939 годзе Міхась Васілёк быў прызваны ў польскае войска. Набліжалася польска-нямецкая вайна. Потым баі, гітлераўскі палон, доўгія дні няволі. Апынуўся за калючым дротам у Баварыі. Да польскіх салдат фашысты адносіліся з асаблівай лютасцю .

Холад, голад, паніжэнне і страх – скрозь былі поўнымі ўладарамі. Нават яму, прывычнаму да гаравання, жыццё здавалася пеклам… Але і там у далёкай Баварыі ён не забывае пра Радзіму.

Верш “ Эх, дзе вы дзе, любімыя прасторы”

За дар паэта, за шчырасць, чуласць і дабрату палонныя паважалі Міхася Васілька і як маглі выказвалі яму сваю любасць.

*1 вяд.* Летам 1941 года ўдалося ўцячы і дабрацца да родных мясцін. З першых дзён звароту дамоў ён разумеў, што не можа заставацца збоку ад барацьбы з фашыстамі. Паэт выконваў заданні партызан. Кіраўніка Скідзельскага раённага антыфашысцкага камітэта Мікалая Бедыса выкрылі і знішчылі фашысты. На яго месца быў прызначаны Міхась

Васілёк. У склад камітэта ўваходзіла 19 антыфашысцкіх груп, якія налічвалі больш 80 чалавек.

Верш “Узнімайце на катаў нажы”

*2 вяд*. Закончылася вайна. Паспытаў гэтай радасці і партызанскі сувязны, разведчык Міхась Васілёк. Без асцярогі хадзіў ён роднымі сцежкамі па родных мясцінах ужо ў новай ролі журналіста.

У 1944-1946 гадах працаваў у Скідзельскай раённай газеце “Чырвоны сцяг”, а пазней – у абласной газеце “Гродзенская праўда”. У гэты час многа дапамагаў маладым тады пісьменнікам: Васілю Быкаву, Аляксею Карпюку. З-пад крыла Васілька выйшлі таксама паэты: Пятрусь Макаль, Аўгіння Кавалюк, Данута-Бічэль Загнетава і іншыя.

*1 вяд.* Любіла слухаць Васілька моладзь Гродзеншчыны. Былая студэнтка Аўгіння Кавалюк пісала: “Васілёк любіў моладзь. Сярод моладзі ён сам выглядаў маладым. Моладзь любіла яго, запрашала на вечары, дыспуты. Да вучняў, моладзі ён звяртаўся сардэчна, чула: ”Наша змена, наша падмога, вучыцеся, дужэйце!”

*2 вяд.* Дзе б ні быў Міхась Васілёк, ён ніколі не забываў свае родныя мясціны. Прыязджаў у мілую сэрцу Баброўню, на Скідзельшчыну, сустракаўся са сваімісваякамі, землякамі.

Верш ”Б’ецца вецер у шыбы акон”

*Куратар:* У сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння 14 лістапада 1955 года Васілёк атрымаў шмат віншаванняў. Сярод іх было пісьмо Максіма Танка: “На тваю долю, як аднаго са старэйшых нашых пісьменнікаў, выпала больш перажыць і можа больш бачыць гора ў сваім жыцці. Але і вялікае шчасце выпала на тваю долю, як і на долю ўсяго нашага пакалення: быць не толькі песняром народнага гора, але і светлай яго радасці, яго гераічных подзвігаў, яго перамог, 50 год і якіх год! Не сорам аглянуцца назад! Ёсць што ўспомніць. Ёсць за што паціснуць тваю працавітую далонь!”

*2 вяд.* Напачатку  верасня 1960 года Гродна развітвалася з Васільком, якога не стала на 55-ым годзе жыцця. Праводзіць яго ў апошні шлях прыйшлі тысячы людзей. Смерць скасіла яго раптоўна. Але ён застаецца жывым. Жыццё яго патухла рана, але на роднай зямлі  будуць цвісці васількі. Памяць пра любімага паэта не згасне.

Верш ”Сее восень янтар”

*1 вяд.* Праз усё жыццё і творчасць Васілёк пранёс непагасную любоў да свайго народа, да яго культуры, мовы, да свайго краю да бацькоўскай зямлі з яе лугамі, з песнямі жаўрукоў і сярэбраным  звонам крыніц. На Скідзельшчыне паэт сеяў насенне чалавечай дабрыні, праўды, справядлівасці. Яго літаратурная ніва ўзбагаціла не толькі яго землякоў, але і ўсё духоўнае жыццё нашай краіны.

*2 вяд.* Тваіх я вершаў праглядаю томік,
Радкі напісаны ў ім сэрцам і душой.
Мне не забыць той шэры домік
У горадзе над Нёманам ракой.
Цябе даўно няма, а домік знеслі,
На месцы тым стаіць каменны гмах.
У вецці чую адгалоскі песняў
Тваіх я ў акацыі кустах.
Жывы твой палымяны голас
Не знішчыць, не заглушыць час.
Блакіт валошкі, збожжа колас
Напомніць нам цябе не раз.

*Куратар:* Хто сёння ідзе да Васілька, адкуль?  Самыя розныя людзі з усіх куткоў нашай зямлі.Усе, хто цікавіцца творчасцю і жыццём песняра, тыя, хто адчувае яго паэзію душой.

І няхай кожнаму, хто прыйдзе да песняра па душэўнай патрэбе, тут добра і лёгка думаецца. Хай светла будзе  на душы.